View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Дыктант як від практыкавання: навучальны тлумачальны дыктант

Любы навучальны дыктант выкарыстоўваецца з мэтай выпрацоўкі і замацавання пэўных арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў.

Тлумачальны дыктант – гэта такі від дыктанта, пры якім спачатку адбываецца запіс слоў (спалучэнняў слоў) або сказаў, а потым даецца тлумачэнне арфаграм або (і) пунктаграм. Тлумачальны дыктант праводзіцца найчасцей на этапе замацавання вывучанага матэрыялу, аднак такі від практыкавання можна выкарыстаць і падчас праверкі дамашняга задання, а таксама пры паўтарэнні і абагульненні раней вывучанага. Тлумачальны дыктант, як і іншыя навучальныя дыктанты, можа быць як зрокавым, так і слыхавым.

Тэкставыя тлумачальныя дыктанты, як правіла, выкарыстоўваюцца для праверкі засваення не толькі тых арфаграм або пунктаграм, якія вывучаюцца, але і ўжо вывучаных, што дазваляе ўзнаўляць і актуалізаваць раней набытыя веды, уменні і навыкі. Слоўнікавыя тлумачальныя дыктанты маюць на мэце трэніраваць засваенне толькі аднаго пэўнага правіла або некалькіх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Мартын Рыль ехаў са стрэльбай на чоўне (ў, у)скрай Прып…ці. Ён туліцца бліжэй да чаротаў каб спрытней па…красціся да дзікіх качак. Яму пашчас…лівілася настраляць іх штук пяць. З таго боку Прып…ці шыбуе човен. На носе чоўна ляжыць зялёная вязка свежай травы і ёмкі сноп пышнага кучаравага чароту. На чоўне бялее гнуткая, руплівая дз…вочая постаць у чырвонай хуста…цы завязанай канцамі назад. Спрытна мільгае вясло ў яе пру…кіх руках і човен борзда і роўна с…лізгаціць па шырокім лоне спакойнай Прып…ці. Мінуўшы сярэдзіну рэчкі човен крута верне ў/бок Мартына. Мартын сумыслу едзе павольна і пільна ўзіраецца ў затокі дзе любяць жыраваць качкі і не/глядзіць на човен з дзяўчынаю хоць ужо ведае хто на ім плыве. Але яму прыемна.

– А я табе ўсіх качак папужаю чуецца малады звонкі дз…вочы голас і следам за гэтым даносіцца яе крык.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

* Патлумачце значэнне слоў *шыбаваць*, *борзда*, *ёмкі*. Падбярыце сінонімы да слова *спрытна*.

2. Запішыце тэкст пад дыктоўку згодна з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Адштурхнуўшыся ад берага, Лаўрэн едзе ўверх па Дняпру, да самага дальняга семафора свайго ўчастка. Адну за другой запальвае семафорныя лямпы і ўсцягвае іх на самы верх мачтаў. Дзе газы падалье, дзе старанна пратрэ закуранае шкло, падрэжа і падчысціць кнот. І калі запаліцца апошняя лямпа, едзе Лаўрэн да невялікай выспачкі, заросшай лазняком і алешнікам, выцягвае човен, раскладвае цяпельца, назбіраўшы ўсякага сушняку з ламачча, павыкіданага вадой. Тут і алешнікавы цюльпак, і яловае бервянцо – адбіліся ад плытоў, – тут і павыкіданыя вадой бярозавыя пярэвіткі, і ўсякая іншая драбяза.

Лаўрэн грэе над вадой старэчыя рукі і, уладзіўшыся над узятым з чоўна сене, пазірае ўздоўж рачных берагоў, углядаецца ў запаленыя семафоры. Чырвоныя і белыя, мільгацяць яны ў загусцелай цемені ночы і адсвечваюць то пырскамі, то дрыготкімі круцёлкамі на цёмнай вадзе. Лаўрэн глядзіць і ўздыхае. Прызвычаіўся ўжо так. Гляне на што – уздыхне, падумае – уздыхне.

Міхась Лынькоў. "На чырвоных лядах".

* Патлумачце значэнне слоў *човен*, *кнот*, *цяпельца*, *цюльпак*, *пярэвіткі*, *выспачка*, карыстаючыся тлумачальнымі слоўнікамі.

3. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Па глыбіні псіхалагічных даслед(ава, ва)нняў чалавечай душы Кузьму Чорнага адны параўноўваюць з Дастаеўскім іншыя з Бальзакам славутым французскім піс…меннікам. Яшчэ ў 30-я гады беларуская крытыка выказвала меркаванне што задуманая серыя раманаў Чорнага пра гістарычны шлях беларусаў "ад паншчыны да нашых дзён" у (А, а)йчыннай літаратуры можа стаць з'явай не мен…ш прыкметнай чым вядомыя творы Бальзака з серыі "Чалавечая камедыя".

Чорны разумеў што паставіў перад сабою н…простую задачу якая вымушае што/дзё(н, нн)ай карпатлівай працы. Але працаваць ён сын бедных сялян быў прывучаны з маленства. Больш таго, ад продкаў перадалося яму жаданне любую работу выкон(ыва, ва)ць так каб не было сорамна перад людз…мі. Дзед піс…менніка Міхал Парыбак якога ў вёсцы клікалі Чорны (вось адкуль псеўданім творцы, а сапраўднае імя і прозвішча яго, як вядома, Мікалай Карлавіч Раманоўскі) цудоўна ведаў ткацкае рамяство яго сурвэткі высока цаніў сам князь Радзівіл. Пра такіх як бацька Мікалая Карлавіча гавораць майстар на ўсе рукі. Ён быў і цеслем і шаўцом і краўцом. Дарэчы сам Чорны ўжо ў дзяцінстве здзіўляў бацькоў сваімі акцёрскімі здольнасцямі уменнем добра маляваць і іграць на розных музычных інструментах.

І ўсё ж прага да літаратурнай творчас…ці перамагла ўсе іншыя захапленні.

Алесь Бадак. "Чалавечая драма" Кузьмы Чорнага".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Падбярыце сінонімы да слова *карпатлівы*. Растлумачце значэнне слова *цесля*.

4. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыіі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

А ў календарах і на Беларусі – восень… Апалае лісце і дажджыстыя дні… Калісьці пяцьдзясят гадоў таму гэтай парою ў палескай вёсачцы на Берасцейшчыне нарадзілася дзяўчынка Жэня, якой наканавана было стаць выдатнай беларускай паэткай.

Жэня Янішчыц заўсёды ішла на голас Ліры, і ён, гэты голас, чуўся ёй то з роднага Палесся (і ніхто пра Палессе, пра тамтэйшых людзей так прыгожа-высока не змог расказаць, як расказвала, апявала яна ў сваіх вершах); то раптам гэты голас кратаў нейкія вельмі таемныя струны, і тады Жэня пісала вершы пра каханне – гарачае, трапяткое, а найчасцей такое, калі “смяюцца вочы, поўныя святла, а на губах – гарчавінка самоты”. Яе лірычны радок пратканы праз усю беларускую паэзію залатою ніткаю. І ўжо немагчыма ўявіць нашу літаратуру без імя Яўгеніі Янішчыц. Свой творчы шлях яна распачала кніжкаю “Снежныя грамніцы”, якая засведчыла, што ў беларускую паэзію прыйшоў моцны, надзвычай пранікнёны светлы голас.

Раіса Баравікова. “Ластаўка вясны”.

* Растлумачце значэнне слоў *тамтэйшы*, *грамніцы, ліра.* Як вы разумееце выраз *расказаць прыгожа-высока* ?

5. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы. Лічбы запішыце словамі.

Зусім не/аспрэчваючы мудрага (Г, г)ётаўскага сцв…рджання (хто хоча зразумець паэта, павінен пабываць у паэтавым краі), каб зразумець Паэта я мусіў пабываць у краі для яго чужым дзе ён памёр і пахаваны. Можа таму, што жыццё гэтага генія ад пачатку і да канца складзена з загадак якія ўжо даўно разгад(ыва, ва)юць і будуць яшчэ доўга разгад(ыва, ва)ць уседлівыя дасле…чыкі і проста зацікаўл…ныя людзі. Такое кароткае жыццё і такія доўгія пошукі разгадак…

У чэрвені 1975 года пашэнціла мне на добрую паўднёвую дарогу якая і прывяла ў найсонечную Ялту шчаслівае ластаўчына гняздзечка ўсіх аматараў а…пачынку. Рамантычных зваб прыўзнёслых а…чуванняў у б…стурботным (Я, я)лцінскім абсягу было аж залішне. Пяшчотны прасвечаны да самага дна блакіт мора і мяккі духмяны водар паветра, настоены на чыстым дыханні багатай горнай раслі(н, нн)асці, усё гэта нагад(ыва, ва)ла нейкае незвычайнае блакітнае варыва якое хтос…ці прыправіў самымі экзатычнымі зёлкамі. Усё вабіла і чаравала асабліва тых хто можа ў/першыню бачыў само мора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сапраўдныя свае звабы мора здольнае паказаць толькі над/вечар калі прыстынуць берагавы жвірок і каменне падыме свае крылы вецер/свяжак і ў сінявата/чырвоным паўзмроку ра…плывуцца і згладзяць свае абрысы далёкія і блізкія вяршыні гор. Такой парой я пакідаў свой утульны пакойчык (Д, д)ома творчасці імя Чэхава і пакручастай сцяжынай спускаўся з гары каб пабыць сам/насам з морам.

Казімір Камейша. “Пад пошум хваль, ля сіняй бухты…”.

* Патлумачце значэнне слоў *звабы*, *зёлкі*. Падбярыце сінонім да слова *пакручасты*. Пра якога паэта ідзе гаворка ў тэксце? Чаму аўтар ужывае слова *Паэт* з вялікай літары?

6. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку. Лічбы запішыце словамі.

Далёкае XII стагоддзе не данесла шмат інфармацыі пра сябе. Летапісцы занатоўвалі толькі самае важнае, значнае. Трэба было быць вельмі неардынарнаю, цікаваю асобаю, каб пра цябе напісалі хоць некалькі радкоў. Мабыць, Ефрасіння Полацкая зрабіла шмат добрага Полацкай зямлі, калі пра яе напісалі кнігу, поўную шчырай любові і павагі. Хоць твор гэты і адносіцца да царкоўна-рэлігійнай літаратуры, дзе на чалавека як на асобу мала звярталася ўвагі, а на першы план ставілася яго поўная адданасць Богу, усё ж такі ў “Аповесці жыцця і смерці Ефрасінні Полацкай” вельмі яскрава выяўляецца вобраз галоўнай гераіні. Ефрасіння – не толькі аскетычка, жыццё якой прайшло ў пастах і малітвах, Ефрасіння яшчэ і вельмі моцная жанчына, якая выконвала ўсе пастаўленыя перад сабой мэты. Вырашана стаць манахіняй – стала, вырашана пабудаваць храм – пабудавала, вырашана пайсці ў Іерусалім - і гэта зрабіла. Не пабаюся сказаць, што лічу яе сілу волі як дух мацнейшым за дух любога полацкага князя тых гадоў. Да таго ж гэтая жанчына была вельмі адукаваная: у гісторыі Еўропы таго часу вы, бадай, не знойдзеце жанчын з такімі ж ведамі, як у Ефрасінні.

Марыя Шахаўцова. “…Для ўсіх была ўсім…”.

* Падбярыце сінонімы да слова *неардынарны*. Да якога тыпу маўлення належыць тэкст? Дакажыце сваю думку.

7. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Не будзе перабольшваннем сказаць што яшчэ і цяпер творчасць Купалы і Коласа вывучаецца ў школе крыху аднабакова. А між тым творчасць кла(сс,с)ікаў разнастайная – скажам, якая шырокая і глыбокая (К, к)упалава лірыка альбо філасо…ская паэзія, што све…чаць пра багаты духоўны свет як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аўтара, так і яго герояў! Праўда Коласу, бадай, пашанцавала больш – асабліва з вывучэннем яго паэмы “Новая зямля”. Гэты твор перажыў многія тагачасныя і пазнейшыя крытычныя наскокі н…ўхільна сц…вердзіўся ж…мчужынай (К, к)оласавага паэтычныга плёну і ўсёй беларускай літаратуры энцыклапедычна адлюстраваў жыццё побыт духоўны свет тагачаснай вёскі і часткова горада натхніў да далейшага глыбейшага развіцця нашу прозу. Так, так, прозу бо ў “Новай зямлі” (ў, у)дала спалучыліся паэзія і проза ярка даследавана пэўная эпоха чалавечы свет з зямлёй і космасам. Пазнейшая проза не магла і цяпер не можа не ўлічыць (К, к)оласавай лірыкі і натуральнай заземленасці мастацкай дэталізацыі эстэтычна-філасофскага заглыблення ў асэнсаванні жыццёвых з’яў сацыяльных пераўтварэнняў і ўнутранага чалавечага свету. Не/выпадкова ж не толькі нашы паэты але і празаікі гэтак любяць “Новую зямлю”: яна такая адзіная і непаўторная, не/выпадкова ж сын беларускай зямлі касманаўт Пётр Клімук узяў яе з сабой у высокае неба!

Генрых Далідовіч. “Новы Колас”.

* Растлумачце значэнне слоў *класік*, *лірыка*. Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст.

8. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Аўтастоп, або з англійскай “хіч-хайкінг”, – гэта вандроўкі па свеце на хоць-якім спадарожным транспарце: на аўтамабілях, цягніках, самалётах, лакаматывах, вазах, – увогуле на ўсім, што рухаецца ў патрэбным кірунку – са згоды кіроўцы ці гаспадара транспартнага сродку. Для адных аўтастоп – гэта нязручны і небяспечны спосаб перамяшчэння, звязаны з нудотным стаяннем на дарозе з узнятай рукой, з начлегам у спальніку “ў лесе пад кустом”, непаўнавартасным і несвоечасовым харчаваннем ды з неабходнасцю прыстасоўвацца да розных абставін. А для іншых аўтастоп – гэта захапляльныя прыгоды, у якіх само паняцце “дарога” набывае надзвычайны сэнс. Калі можна ўпэўніцца, што шанцаванне – гэта дыягназ, што ўсё, што адбываецца з вамі ў дадзены момант у дадзеным пункце прасторы сапраўды не/паўторна і ніхто не здольны паўтарыць ваш шлях пасля вас. І ўсе згодны з тым, што аўтастоп – найлепшая і найтаннейшая магчымасць пабачыць свет.

Крысціна Карчэўская. “Аўтастоп, ці як вандраваць, не марнуючы грошай”.

* Вызначце, да якога тыпу маўлення і стылю належыць тэкст. Дакажыце сваю думку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Як адзначаюць дасле...чыкі лірычнай паэзіі, (не, ня)/гледзячы на тое, што яе аснову складаюць вобразы/перажыванні лірычная паэзія не можа абмяжоўвацца адлюстраваннем толькі суб...ектыўнага свет...: у рэальным жыцці немагчыма а...дзяліць тыя прадметы і з...явы знешняга свет... якімі гэтыя перажыванні выкліканы. А...сюль узнікае неабходнасць увесці ў склад лірычнага верш... элементы прадметна/рэчыўнага свет... і іх слоўна/моўныя адзінкі. Таму тыповая мадэль лірычнага верш... ўключае ў свой склад тры асноўны... кампанент... р...альны свет пачуццё і паэтычную думку. Пры гэтым думка як бы падводзіць вынік аўтарскай р...флексіі і змя...чаецца як правіла ў канцы верш... або страфы – утвараецца лірычны сюж...т створа(н, нн)ы перапляценнем трох кампанентаў з іх бясконца/зменлівымі не/прадбача(н, нн)ымі с...адносінамі.

П...йзажныя ...образы ў лірыц... моцныя сро...кі выражэння нацы...нальна/патры...тычных пачуццяў бо кожны паэт адухо...лены любо...ю да прыроды якая з...яўляецца неад...емнай часткай яго Радзімы.

Міхась Цікоцкі. “Урокі моўнага майстэрства”.

* Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Патлумачце значэнне слова *р...флексія* і выразаў *вобразы/перажыванні, слоўна/моўныя адзінкі*, *лірычны с...жэт*.

10. Запішыце тэкст пад дыктоўку згодна з правіламі беларускай арфаграфіі і пуктуацыі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Плён працы Аркадзя Наркевіча прарос добрым зернем: сваім спадчыннікам ён пакінуў амаль чатырыста прац. Яны знітоўваюцца ў адну вялікую кнігу, што паўстае перад пакаленнямі велічным гмахам вучонасці, навуковай руплівасці і дбайнасці, але зайсці ў які наканавана не кожнаму. Толькі таму, хто мае ўлюбёнасць у слова, хто дасягнуў адчування сваёй Айчыны, мовы, раскрыецца гэтая скарбніца Наркевічавых думак і памкненняў. А значыць, ён працаваў на сёння і на будучае.

Колькі журналістаў прайшло праз яго добразычлівасць, чуласць, розум і сабраную, здаецца, з крыніц роднай Капыльшчыны прафесарскую інтэлігентнасць, вытрымку і талерантнасць! Дзе ёсць газета, часопіс, рэдакцыя, там жывуць яго словы, загартоўваецца моц беларускага інтэлекту, развіваецца спадчына беларускай журналістыкі.

Віктар Іўчанкаў. “Мовазнаўчая спадчына прафесара Наркевіча”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Падбярыце сінонімы да слоў *руплівасць*, *талерантнасць*, а таксама антонімы да слоў *чуласць*, *вытрымка*. Патлумачце значэнне выразу *ён працаваў...на будучае*.

11. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

На беларускіх землях вас...мна...атае стаго(дз, ддз)е гэта час войнаў па...ста(н, нн)яў сацы...льных канфліктаў і м...жканф...сі...нальных сутычак але гэта і час этнічнай кансалідацыі беларускага народа абуджэ(н, нн)я цікавасці да яго гісторыі культуры час плё(н, нн)ай творчай дзейнасці многіх нашых з...млякоў. Адным з іх з...яўляецца гісторык і царкоўны дзе...ч Ігнат Кул...чыцкі якога заслужа(н, нн)а называюць першым дасле...чыкам беларускіх старажытнасцей.

(Не, ня)/гледзячы на вялікае значэнне асобы Ігната Кул...чыцкага для беларускай гісторыі сёння яго жыццёвы шлях і творчая спа...чына застаюцца слаба/вывучанымі. У айчы(н, нн)ай гістары...графіі яму прысвечаны адзінкавыя не/вялікія публікацыі не/пазбаўленыя шматлікіх недакладнасцей. Праз не/дастатковае знаёмства беларускіх дасле...чыкаў з замежнай на...уковай літаратурай па/за іх увагай засталася пераважная большасць работ Ігната Кул...чыцкага.

І ...краінскія і польскія дзе...чы лічаць Ігната Кул...чыцкага адным з выдатных дзе...чаў іх культуры. Праведзены аналіз творчай спа...чыны Ігната Кул...чыцкага дазваляе нам звязаць яго асобу з Белару(с, сс)ю, бо ён пра...ставіў самой Еўропе Беларусь край багаты тал...навітымі людз...мі і кул...турнымі помнікамі.

Аляксандр Суша. “Ля вытокаў беларускай гістарычнай навукі: творчая спа...чына Ігната Кул...чыцкага”.

* Вызначце стыль тэксту. Абгрунтуйце адказ. Патлумачце значэнне слоў *м...жканф...сі...нальныя*, *кансалідацыя*, *гістары...графія*. Да якой сферы ўжывання адносяцца гэтыя словы?

12. Запішыце тэкст пад дыктоўку ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктаграфіі. Растлумачце правапіс асобных (падкрэсленых) арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Напэўна, шчаслівы той аўтар, калі чытач ці глядач пасля знаёмства з яго творамі адчувае раптам у сабе неспадзеўнае трапяткое хваляванне, калі ў памяці, нібы на палатне пацямнелага ад часу экрана, пракручваюцца кадры нечага свайго, патаемнага, разбудзіўшы пачуцці і ўспаміны, а лёсы герояў гэтых твораў стануць неабыякавымі табе.

Проза Васіля Ткачова даўно стала адметнай з’явай у нашай літаратуры. Не ўсе яго героі – анёлкі, не ва ўсіх склалася жыццё так, як хацелася б, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсе яны – людзі, і ва ўсіх свой унутраны свет, свая душа, у якой, нягледзячы на ўсе супярэчнасці і выбрыкі лёсу, не згасаюць іскрынкі чалавечнасці, дабрыні, спагаднасці, часам ужо змяльчэлай, прыглухлай ад няўмольнай рэчаіснасці, але годнай, вартай прыстойнага стаўлення да сваёй асобы.

Мікола Чарняўскі. “Да людзей з любоўю ідучы...”

* Знайдзіце ў тэксце вобразныя сродкі мовы і ахарактарызуйце іх. З якой стылістычнай мэтай яны ўжыты?

13. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Растлумачце правапіс прапушчаных арфаграм і пунктаграмы, сфармулюйце правілы.

Падарожнічаць можна па/рознаму. Тра...ыцыйна гэта як вядома робіцца так бярэцца білет на пэўны від транспарт... і калі ласка у дарогу. Вядома гэта зручна аднак ты прывяза(н, нн)ы да пэўнага маршрут... і не мож...ш спыніцца там дзе захацелася б. Куды зручней калі едз...ш на ўласным аўтамабіл... ці скажам на велас...педзе. А пешая прагулка хоць і марудная прыносіць куды больш задавальнення што хоч...ш тое і пабач...ш з кім захоч...ш з тым і сустрэне...ся. Гэта падарожжа р...альнае бо з адрывам ад дом... у якім жывеш з разлукай няхай і на пэўны час з блізкімі табе людз...мі са зменай звыклых а...ставін.

Калі ж падарожнічаць за...очна то ўсё можна спалучыць. Такое ма...чыма дзякуючы гісторыка/кра...знаўчым дакументальным фільмам навукова/пазнавальным т...л...візійным перадачам бо тое што гучыць па рады... усё ж пазбаўле(н, нн)а візу...льнасці а нездарма кажуць лепш адзін раз убачыць чым сем... разоў пачуць.

Алесь Марціновіч. “Хараство блізкіх дарог”.

* Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Падбярыце сінонімы і антонімы да слоў *марудная*, *р...альнае*, *разлука*.

14. Запішыце пад дыктоўку, растлумачце правапіс толькі падкрэсленых арфаграм.

Холад, халадэча, этыкет, брысці, кап’ютар, цёплы, цеплыня, Еўропа, тысяча, без меры, радыёантэна, радыеметрычны, высокаідэйны, легкадумны, вадасховішча, звышімклівы, падыдзеш, зайграць, пераігрыванне, панісламізм, аўра, аул, ноу-хау, лаўка, каля урны, дождж, рубчык, маладшы, айсберг, поезд, коласаўскія мясціны, Коласаўскія чытанні, Уладыка Нябесны, крый бог, фея, імпрэсарыа, Юпітэр, лідар, ерэтык, дзесятковы, без жартаў, агарафобія, Вадохрышча, прыборабудаўнічы, прыймальны, адысці, раўнд, Ландау, экзамен, берагчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Растлумачце значэнне слоў *ноу-хау*, *агорафобія*. З 3 словамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

15. Спішыце словы (спалучэнні слоў), устаўляючы патрэбныя літары. Растлумачце правапіс арфаграм.

Р…чны, р…чанька, партфолі(а, о), кр…шаны, фламаст…р, к…раміка, дз…сятка, н(е, я) б(е, я)з прычыны, мес…ц, рады(е, я)графія, рады(е, я)ізатоп, ф…ндасховішча, раб…тадавец, в…лікасвецкі, В…лікабрытанія, рацы(ё,о)н, ажы(я, а)таж, аві(я, а)цыя, інвары(я ,а)нт, бі(ё, о)лаг, суб(і, ы)нтэндант, за(і, й)кацца, пера(і, й)грываць, без(і, ы)дэйнасць, па(в/ )ук, (в/ )унікум, ці(в/ )ун, (в/ )устрыца, (В/ )Ушачы, а(у, ў)дыторыя, ба(у, ў)л, а(у, ў)кацць, кансілі(у, ў)м, со(у, ў)с, для (у, ў)збекаў, ва (У, Ў)збекістан, А…ганістан, бераво…чык, роўня(дзь, ць), чыс(ц, т)юткі, мун(дз, д)ір, (дз, д)юны, бар(дз, д)юр, Гаі(ц, т)і, навако(лл, л)е, Сюза(н, нн)а, выя(здн, зн)ы, фарпо(стн, сн)ы, ліпен…скі, (А, а)нёл.

* Складзіце сказы са словамі *ажы(я, а)таж*, *ба(ў, у)л*, *(дз, д)юны*.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

**Даведка**

1. Мартын Рыль ехаў са стрэльбай на чоўне ўскрай Прыпяці. Ён туліцца бліжэй да чаротаў, каб спрытней падкрасціся да дзікіх качак. Яму пашчаслівілася настраляць іх штук пяць. З таго боку Прыпяці шыбуе човен. На носе чоўна ляжыць зялёная вязка свежай травы і ёмкі сноп пышнага кучаравага чароту. На чоўне бялее гнуткая, руплівая дзявочая постаць у чырвонай хустачцы, завязанай канцамі назад. Спрытна мільгае вясло ў яе пругкіх руках, і човен бразда і роўна слізгаціць па шырокім лоне спакойнай Прыпяці. Мінуўшы сярэдзіну рэчкі. човен крута верне ў бок Мартына. Мартын сумыслу едзе павольна і пільна ўзіраецца ў затокі, дзе любяць жыраваць качкі, і не глядзіць на човен з дзяўчынаю, хоць ужо ведае, хто на ім плыве. Але яму прыемна.

– А я табе ўсіх качак папужаю, -- чуецца малады звонкі дзявочы голас, і следам за гэтым даносіцца яе крык.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

3. Па глыбіні псіхалагічных даследаванняў чалавечай душы Кузьму Чорнага адны параўноўваюць з Дастаеўскім, іншыя – з Бальзакам, славутым французскім пісьменнікам. Яшчэ ў 30-я гады беларуская крытыка выказвала меркаванне, што задуманая серыя раманаў Чорнага пра гістарычны шлях беларусаў “ад паншчыны да нашых дзён” у айчыннай літаратуры можа стаць з’явай не менш прыкметнай, чым вядомыя творы Бальзака з серыі “Чалавечая камедыя”.

Чорны разумеў, што паставіў перад сабою няпростую задачу, якая вымушае штодзённай карпатлівай працы. Але ён сын бедных сялян быў прывучаны з маленства. Больш таго, ад продкаў перадалося яму жаданне

любую работу выконваць так, каб не было сорамна перад людзьмі. Дзед пісьменніка Міхал Парыбак, якога ў вёсцы клікалі Чорны (вось адкуль псеўданім творцы, а сапраўднае імя і прозвішча яго, як вядома, Мікалай Карлавіч Раманоўскі), цудоўна ведаў ткацкае рамяство, яго сурвэткі высока цаніў сам князь Радзівіл. Пра такіх, як бацька Мікалая Карлавіча гавораць: майстар на ўсе рукі. Ён быў і цеслем, і шаўцом, і краўцом. Дарэчы, сам Чорны ўжо ў дзяцінстве здзіўляў бацькоў сваімі акцёрскімі здольнасцямі, уменнем добра маляваць і іграць на розных музычных інструментах.

І ўсё ж прага да літаратурнай творчасці перамагла ўсе іншыя захапленні.

Алесь Бадак. “Чалавечая драма” Кузьмы Чорнага”.

5. Зусім не аспрэчваючы мудрага гётаўскага сцверджання (хто хоча зразумець паэта, павінен пабываць у паэтавым краі), каб зразумець Паэта, я мусіў пабываць у краі для яго чужым, дзе ён памёр і пахаваны. Можа таму, што жыццё гэтага генія ад пачатку і да канца складзена з загадак, якія ўжо даўно разгадваюць і будуць яшчэ доўга разгадваць уседлівыя даследчыкі і проста зацікаўленыя людзі. Такое кароткае жыццё і такія доўгія пошукі разгадак…

У чэрвені 1975 года пашэнціла мне на добрую паўднёвую дарогу, якая і прывяла ў найсонечную Ялту, шчаслівае ластаўчына гняздзечка ўсіх аматараў адпачынку. Рамантычных зваб, прыўзнёслых адчуванняў у бестурботным ялцінскім абсягу было аж залішне. Пяшчотны, прасвечаны да самага дна блакіт мора і мяккі, духмяны водар паветра, настоены на чыстым дыханні багатай горнай расліннасці, – усё гэта нагадвала нейкае незвычайнае блакітнае варыва, якое хтосьці прыправіў самымі экзатычнымі зёлкамі. Усё вабіла і чаравала асабліва тых, хто можа ўпершыню бачыў само мора.

Сапраўдныя свае звабы мора здольнае паказаць толькі надвечар, калі прыстынуць берагавы жвірок і каменне, падыме свае крылы вецер-свяжак і ў сінявата-чырвоным паўзмроку расплывуцца і згладзяць свае абрысы далёкія і блізкія вяршыні гор. Такой парой я пакідаў свой утульны пакойчык Дома творчасці імя Чэхава і пакручастай сцяжынай спускаўся з гары, каб пабыць сам-насам з морам.

Казімір Камейша. “Пад пошум хваль, ля сіняй бухты…”.

7. Не будзе перабольшваннем сказаць, што яшчэ і цяпер творчасць Купалы і Коласа вывучаецца ў школе крыху аднабакова. А між тым творчасць класікаў разнастайная – скажам, якая шырокая і глыбокая Купалава лірыка альбо філасофская паэзія, што сведчаць пра багаты духоўны свет як аўтара, так і яго герояў! Праўда, Коласу, бадай, пашанцавала больш – асабліва з вывучэннем яго паэмы “Новая зямля”. Гэты твор перажыў многія тагачасныя і пазнейшыя крытычныя наскокі, няўхільна сцвердзіўся жамчужынай Коласавага паэтычнага плёну і ўсёй беларускай літаратуры, энцыклапедычна адлюстраваў жыццё, побыт, духоўны свет тагачаснай вёскі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часткова горада, натхніў да далейшага, глыбейшага развіцця нашу прозу. Так, так, прозу, бо ў “Новай зямлі” ўдала спалучыліся паэзія і проза, ярка даследавана пэўная эпоха, чалавечы свет з зямлёй і космасам. Пазнейшая проза не магла і цяпер не можа  не ўлічыць Коласавай лірыкі і натуральнай заземленасці, мастацкай дэталізацыі, эстэтычна-філасофскага заглыблення ў асэнсаванні жыццёвых з’яў, сацыяльных пераўтварэнняў і ўнутранага чалавечага свету. Невыпадкова ж не толькі нашы паэты, але і празаікі гэтак любяць “Новую зямлю”: яна такая адзіная і непаўторная, невыпадкова ж сын беларускай зямлі, касманаўт Пётр Клімук, узяў яе з сабой у высокае неба!

Генрых Далідовіч. “Новы Колас”.

9. Як адзначаюць даследчыкі лірычнай паэзіі, нягледзячы на тое, што яе аснову складаюць вобразы-перажыванні, лірычная паэзія не можа абмяжоўвацца адлюстраваннем толькі суб’ектыўнага свету: у рэальным жыцці немагчыма аддзяліць тыя прадметы і з’явы знешняга свету, якімі гэтыя перажыванні выкліканы. Адсюль узнікае неабходнасць увесці ў склад лірычнага верша элементы прадметна-рэчыўнага свету і іх слоўна-моўныя адзінкі. Таму тыповая мадэль лірычнага верша ўключае ў свой склад тры асноўныя кампаненты: рэальны свет, пачуццё і паэтычную думку. Пры гэтым думка як бы падводзіць вынік аўтарскай рэфлексіі і змяшчаецца, як правіла, у канцы верша або страфы – утвараецца лірычны сюжэт, створаны перапляценнем трох кампанентаў з іх бясконца зменлівымі, непрадбачанымі суадносінамі.

Пейзажныя вобразы ў лірыцы – моцныя сродкі выражэння нацыянальна-патрыятычных пачуццяў, бо кожны паэт адухоўлены любоўю да прыроды, якая з’яўляецца неад’емнай часткай яго Радзімы.

Міхась Цікоцкі. “Урокі моўнага майстэрства”.

11. На беларускіх землях васямнаццатае стагоддзе – гэта час войнаў, паўстанняў, сацыяльных канфліктаў і міжканфесіянальных сутычак, але гэта і час этнічнай кансалідацыі беларускага народа, абуджэння цікавасці да яго гісторыі, культуры, час плённай творчай дзейнасці многіх нашых землякоў. Адным з іх з’яўляецца гісторык і царкоўны дзеяч Ігнат Кульчыцкі, якога заслужана называюць першым даследчыкам беларускіх старажытнасцей.

Нягледзячы на вялікае значэнне асобы Ігната Кульчыцкага для беларускай гісторыі, сёння яго жыццёвы шлях і творчая спадчына застаюцца слаба вывучанымі. У айчыннай гістарыяграфіі яму прысвечаны адзінкавыя невялікія публікацыі, не пазбаўленыя шматлікіх недакладнасцей. Праз недастатковае знаёмства беларускіх даследчыкаў з замежнай навуковай літаратурай па-за іх увагай засталася пераважная большасць работ Ігната Кульчыцкага.

І ўкраінскія, і польскія дзеячы лічаць Ігната Кульчыцкага адным з выдатных дзеячаў іх культуры. Праведзены аналіз творчай спадчыны Ігната Кульчыцкага дазваляе нам звязаць яго асобу з Беларуссю, бо ён прадставіў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самой Еўропе Беларусь – край, багаты таленавітымі людзьмі і культурнымі помнікамі.

Аляксандр Суша. “Ля вытокаў беларускай гістарычнай навукі: творчая спадчына Ігната Кульчыцкага”.

13. Падарожнічаць можна па-рознаму. Традыцыйна гэта, як вядома, робіцца так: бярэцца білет на пэўны від транспарту і, калі ласка, у дарогу. Вядома, гэта зручна, аднак ты прывязаны да пэўнага маршруту і не можаш спыніцца там, дзе захацелася б. Куды зручней, калі едзеш на ўласным аўтамабілі ці, скажам, на веласіпедзе. А пешая прагулка, хоць і марудная, прыносіць куды больш задавальнення: што хочаш, тое і пабачыш, з кім захочаш, з тым і сустрэнешся. Гэта падарожжа рэальнае, бо з адрывам ад дому, у якім жывеш, з разлукай, няхай і на пэўны час, з блізкімі табе людзьмі, са зменай звыклых абставін.

Калі ж падарожнічаць завочна, то ўсё можна спалучыць. Такое магчыма дзякуючы гісторыка-краязнаўчым дакументальным фільмам, навукова-пазнавальным тэлевізійным перадачам, бо тое, што гучыць па радыё, усё ж пазбаўлена візуальнасці, а нездарма кажуць: лепш адзін раз убачыць, чым сем разоў пачуць.

Алесь Марціновіч. “Хараство блізкіх дарог”.

15. Рачны, рэчанька, партфоліа, крышаны, фламастар, кераміка, дзясятка, не без прычыны, месяц, радыяграфія, радыеізатоп, фондасховішча, работадавец, велікасвецкі, Вялікабрытанія, рацыён, ажыятаж, авіяцыя, інварыянт, біёлаг, субынтэндант, заікацца, пераігрываць, безыдэйнасць, павук, унікум, цівун, устрыца, Ушачы, аўдыторыя, баул, аукаць, кансіліум, соус, для ўзбекаў, ва Узбекістан, Афганістан, перавозчык, роўнядзь, чысцюткі, мундзір, дзюны, бардзюр, Гаіці, наваколле, Сюзанна, выязны, фарпосны, ліпеньскі, анёл.

Святлана Мароз,
Марына Ржавуцкая,
Таццяна Старасценка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ